Я. Гамарнік.

# За генэральную лінію партыі і рашучае разгортваньне бальшавіцкай самакрытыкі.

Месяцы два таму назад расійскія эмігранты-меншавікі ў „Соц. Вестнике“ так характарызавалі політычнае становішча Савецкага Саюзу: „Політычнае зацішша пануе ў Расіі, але наўрад-ці яно пераживе лета. Пад прыкрыцьцём цішыні нарастае абурэньне сялянства. Шырокай хваляй разьліваецца нездавальненьне непралетарскага насельніцтва гораду, накапляецца злосьць у рабочых масах. На восень палітычны баромэтр яснага надвор'я, як быццам, не прадракае“.

Так вызначае політычнае надвор'е меншавіцкі баромэтр, так, або амаль так, вызначалі і вызначаюць становішча і права-ўхіленцкі і троцкісцкі баромэтры.

Аб чым гаворыць і хлусіць меншавіцкі баромэтр, які абслугоўвае ў асноўным і правых ухілістых і троцкістых? Пераважна аб „політычным зацішшы“, якое нібы мела месца ўлетку. Аб чым гэта сьведчыць? Аб тым, што меншавік? У Савецкім Саюзе і ў нас у Беларусі ўвесь мінулы год і сучасны пэрыод напоўнены бурлівым політычным жыцьцём. Скрозь і ўсюды, у горадзе і ў вёсцы, на ўсіх вучастках будаўніцтва ідзе шалёная клясавая барацьба. Усюды з боямі супроць клясавага ворага прабівае сабе шлях да соцыялізму пралетарыят, апіраючыся на сялянскую беднату і ўмацоўваючы саюз з серадняком. Усе сілы старога сьвету, усе прадстаўнікі і абаронцы капіталізму—кулак, нэпман, царкоўнік, буржуазны спэц—аказваюць шалёнае супраціўленьне нашаму наступленьню. Шкодніцтва, супраціўленьне здачы хлеба дзяржаве, кулацкі тэрор супроць калгасаў і саўгасаў, „тонкая“, варожая нам ідэолёгічная работа, націск клясавага ворага праз дробную буржуазію на асобныя праслойкі рабочае клясы і партыі—мэтоды іх зьвярынай супроць нас барацьбы. Увесь мінулы год, усё лета і пачатак восені напоўнены жорсткай клясавай барацьбой.

Другое паказаньне меншавіцкага баромэтра—„Пад прыкрыцьцём цішыні нарастае абурэньне сялянства. Шырокай хваляй разьліваецца нездавальненьне непралетарскага гораду“. Якое непраўдападобнае глупства, політычная напісьменнасьць, праўда, вартая меншавікоў і ўсіх блізкіх ім па духу. Толькі політычна сьляпы і глухі ня бачыць шалёнай клясавай барацьбы, асабліва ў вёсцы. Аб якім адзіным сялянстве

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы